# РОЛЯ РАДЫЁКАНАЛА «КУЛЬТУРА» Ў ФАРМІРАВАННІ ДУХОЎНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ БЕЛАРУСАЎ

**У. А. Трапянок,**
*канал «Культура» Беларускага радыё*

СМІ былі і застаюцца моцным сродкам уздзеяння на чалавека. Каштоўнасці грамадства, яго ідэалы, нормы, значэнні, сімвалы перадаюцца, у тым ліку, праз сродкі масавай інфармацыі і задаюць сучаснаму чалавеку пэўны спосаб разумення і ацэнкі рэчаіснасці, усведамлення сябе ў нацыянальнай і сусветнай прасторы, прыналежнасці да канкрэтнай нацыі, спасціжэння духоўных каштоўнасцей, характэрных для свайго народа, сваёй зямлі.

Ва ўмовах глабалізацыі для сацыякультурнага развіцця Беларусі першасную значнасць набывае мэтанакіраванае фарміраванне нацыянальнай ідэнтычнасці. З гэтай задачай у аўдыявізуальнай медыяпрасторы краіны, на нашу думку, спраўляюцца два каналы, якія ўваходзяць у склад Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь – канал «Культура» Беларускага радыё і тэлеканал «Беларусь 3». Наша ўвага ў гэтым матэрыяле звернута на функцыянаванне аўдыяльнага сродку масавай інфармацыі.

Канал «Культура» з’явіўся ў выніку рэформы, што адбылася на Беларускім радыё ў пачатку XXI ст. Ідэяй стварэння спецыялізаванай радыёхвалі было вызначана забеспячэнне аўдыяльным кантэнтам адукаванага, цікаўнага, інтэлігентнага, духоўна багатага слухача. Падобных спецыялізаваных станцый ці радыёканалаў у той час не існавала на ўсёй постсавецкай прасторы, таму супрацоўнікам канала «Культура» давялося першымі апрабоўваць новыя журналісткія ідэі, выпрацоўваць прынцыпы вёрсткі вяшчальнай сеткі, знаходзіць сваю стылістыку.

У першы год дзейнасці канала «Культура» (2002 г.) эфір доўжыўся 17 гадзін за суткі, сёння канал гучыць поўныя суткі [1]. У яго праграме – сучасныя праекты па самых розных аспектах культуры. Гэта музычныя перадачы (ад класікі да акустычнай і электроннай музыкі), літаратурна-мастацкія чытанні і драматычныя пастаноўкі, пазнаваль-

ныя, асветніцкія, мастацтвазнаўчыя праекты, дыскусіі, аўтарскія публіцыстычныя праграмы, дзіцячыя блокі, выпускі навін і інш.

Абраны з першых дзён вяшчання дэвіз «Мы выбіраем вечныя каштоўнасці» ўплывае на эфірнае напаўненне канала «Культура». У пачатку вяшчання праграмная вяшчальная палітыка была скіравана на дэманстрацыю фондавых матэрыялаў, найперш музычных і літаратурна-мастацкіх. Затым дадаліся арыгінальныя праекты пра стан і развіццё сучаснай нацыянальнай культуры. У нашы дні структура пабудовы эфіру прадугледжвае чаргаванне перадач розных жанраў і форм – музычных, публіцыстычных, інфармацыйных, літаратурна-мастацкіх праектаў, арыгінальнага і фондавага аўдыякантэнту.

Функцыянаванне канала «Культура» базуецца на багацейшых духоўных традыцыях беларускага народа, закладзеных, у тым ліку, асветнікамі і мысліцелямі, пісьменнікамі, кампазітарамі, іншымі творцамі, і знаходзіцца ў прамой залежнасці ад сучаснага развіцця нацыянальнай беларускай культуры.

Канал «Культура» разлічаны на аўдыторыю, якая цікавіцца айчыннымі і сусветнымі мастацкімі дасягненнямі, клапоціцца аб фарміраванні сваёй асобы, духоўным узбагачэнні праявамі нематэрыяльнай спадчыны. Канал «Культура» дапамагае знайсці адказ на пытанне «Што нас робіць беларусамі?». Важнае значэнне ва ўздзеянні на аўдыторыю належыць інфармацыйным і публіцыстычным перадачам, паколькі менавіта ў іх першасная роля адведзена «жывому» слову, якое належыць не толькі журналістам, а і шматлікім гасцям – экспертам, навукоўцам, даследчыкам, спецыялістам-практыкам.

Інфармацыйныя і публіцыстычныя праекты канала «Культура» знаёмяць слухачоў з актуальнымі падзеямі і мастацкімі працэсамі краіны і свету. Карэспандэнты наведваюць вернісажы, тэатральныя і канцэртныя прэм’еры, навучальныя, творчыя і іншыя ўстановы. Запрошаныя ўдзельнікі радыёперадач, а гэта прадстаўнікі розных галін творчасці, навукі, адукацыі, расказваюць, як фарміравалася нацыянальная культура, вылучаюць яе асаблівасці ў кантэксце сусветнай мастацкай прасторы, акрэсліваюць перспектыўныя напрамкі развіцця. Брэндавым праектам, які існуе з першых гадоў вяшчання, з’яўляюцца «Дыялогі пра культуру». Спачатку перадача выходзіла раз на тыдзень, цяпер яна трансфармавалася ў цыкл з пяці выпускаў на кожны тыдзень і стала пляцоўкай для дыскусій на знач-

ныя падзеі ў сферы нацыянальнага мастацтва, айчыннай літаратуры, сацыяльных і грамадскіх культурных з'яў. Вядучымі праекта ў розныя гады былі і застаюцца мастацтвазнаўцы, культуролагі, філолагі, музыканты, журналісты.

Перадача «Натхнёныя музыкай» (вядучыя Я. Талкачоў і З. Пярфілава) рыхтуецца з удзелам прадстаўнікоў тэатральнай грамадскасці і творчых асоб, у жыцці якіх важную ролю адыгрывае музычнае мастацтва. Радыёверсія праграмы Н. Гальпяровіча «Суразмоўцы» (узор гібрыднага праекта, створанага сумесна з тэлеканалам «Беларусь 3») прапануе гаворкі пра ролю літаратуры і мовы, культуры і прыроды роднага краю на станаўленне творчай асобы гасцей эфіру. Публіцыстычны праект «Арт-гасцёўня» (вядучая Я. Хадоска) прысвечаны інфармаванню пра культурнае жыццё краіны, а таксама знаёмству з сучаснымі творцамі розных кірункаў мастацтва краіны. З навінкамі кнігавыдавецкай справы Беларусі, сучаснымі аўтарамі знаёміць перадача «Кнігарня» (вядучая М. Прохар). Дзякуючы праектам «Планета «Культура»« (аўтар Л. Бялецкая) і «Кругасвет» (аўтар С. Чыжык) у слухачоў ёсць магчымасць атрымаць пацвярджэнне пра ўнікальнасць розных культур свету, у тым ліку беларускай.

Тэмы творчасці, патрыятызму, адданасці сваёй зямлі і культуры з'яўляюцца скразнымі ў большасці публіцыстычных перадач. У якасці чарговага прыкладу можна назваць перадачу «На паліцах фанатэкі». Згодна з канцэпцыяй, яна актуалізуе архіўныя інтэрв'ю са славутымі асобамі, што ўнеслі важкі ўклад у развіццё беларускай культуры.

На раскрыццё творчага патэнцыялу юных беларусаў, захаванне сямейных каштоўнасцей скіраваны дзіцячы праект «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» (кіраўнік праекта Н. Сіротка). Штодзённая праграма ў даступнай для сваёй узроставай катэгорыі форме (разнастайны змест, кароткія хронаметражы, артыстычная падача) далучае слухачоў да літаратурных і музычных здабыткаў Беларусі. Ладзяцца чытанні народных і аўтарскіх казак, твораў класікаў і маладых айчынных літаратараў. Адметнасцю праекта можна назваць яго інтэрактыўнасць, калі слухачы самі ўплываюць на стварэнне радыёкантэнту. У праграме таксама адбываецца знаёмства з творчымі калектывамі Беларусі, якія шляхам аповеду пра сваю дзейнасць абуджаюць цікавасць слухачоў да ўласнай творчасці, заснаванай на традыцыях нашага народа.

Канал «Культура» ў сваёй дзейнасці надае ўвагу рэлігійнаму жыццю. З улікам перавагі ў Беларусі праваслаўных вернікаў ствараюцца штотыднёвыя публіцыстычныя перадачы «Духоўнае слова», «Духоўная спадчына» і «Святло душы» (аўтар Л. Мітаковіч). Яны папулярызуюць традыцыі праваслаўя і хрысціянства ў цэлым.

Амаль 70 працэнтаў эфірнага часу канала «Культура» займае мастацкае вяшчанне, сфарміраванае з музычных і літаратурна-мастацкіх праектаў. Музычны пласт складаюць архіўныя і сучасныя запісы музыкі розных напрамкаў (народная, духоўная, акадэмічная і папулярная музыка), зробленыя ў многіх краінах. Асабліваe значэнне ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці беларусаў, разуменні каранёвых традыцый народа належыць фальклорнай музыцы. Ёй прысвечаны перадачы «Гасцінец» (аўтар Т. Песнякевіч) і «Беларуская этнафонія» (вядучы Я. Талкачоў). У напаўненні праектаў выкарыстоўваюцца запісы народнай, фальклорнай, аўтэнтычнай, аўтарскай музыкі, сабраныя аматарамі ці спецыялістамі Нацыянальнай акадэміі навук, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў падчас экспедыцый, а таксама трансфармаваныя ўзоры музычнай даўніны (постфальклор).

Папулярызацыі прафесійнай акадэмічнай музыкі, якая сфарміравалася ў Беларусі ў XIX–XX стст. і адлюстроўвае рэгіянальныя культурныя традыцыі, садзейнічаюць перадачы, пабудаваныя на аповедах пра жыццё і творчасць кампазітараў, асаблівасці кампазітарскай школы, уплыў сусветнага мастацтва на дзейнасць айчынных музыкантаў з дэманстрацыяй твораў. Спецыялізацыя канала дазваляе выкарыстоўваць у эфіры шматлікія музычныя формы – ад невялікіх мазурак, вальсаў, паланэзаў да працяглых сімфоній і опер айчынных кампазітараў. Гонарам канала з’яўляюцца перадачы «Канцэртная зала», «Амфітэатр» (вядучыя А. Літвіноўскі і Т. Песнякевіч), «Музыка беларускіх кампазітараў», «Класічны рэпертуар» (рэдактар М. Пагоцкая), «Класіка раніцай» (рэдактар Я. Талкачоў), «Музычны вечар» (рэдактары С. Колмак, Я. Талкачоў, Л. Мітаковіч), «Музычны радыётэатр» (рэдактар З. Пярфілава) і інш.

На канале «Культура» арганізавана трансляцыя папулярнай беларускай музыкі, увасобленай пераважна ў аўтарскіх песнях (перадачы «Музычны калейдаскоп» (рэдактар Я. Талкачоў), «Музыка

беларускіх кампазітараў»). Эстрадныя музычныя творы звычайна дапаўняюць інфармацыйна-музычныя, забаўляльныя перадачы, а таксама ўваходзяць у напаўненне канцэртных і іншых тэматычных музычных праграм («Любімыя мелодыі», «Рэтра-хіт» вядучай С. Колмак).

Музычнае вяшчанне канала фарміруецца пераважна за кошт рэтрансляцыі існуючых запісаў. У стварэнні арыгінальнага музычнага кантэнту задзейнічаны творчыя калектывы, якія ўваходзяць у структуру Беларускага радыё – сімфанічны аркестр і заслужаныя калектывы Рэспублікі Беларусь Акадэмічны хор Белтэлерадыёкампаніі і ансамбль народнай музыкі «Бяседа». У праграмах «Музычная студыя» (аўтар Л. Мітаковіч), «Канцэртная зала» і «Музычны радыётэатр» перыядычна ладзяцца трансляцыі прэм'ерных праграм і пастановак з канцэртных і тэатральных залаў краіны.

Літаратурна-мастацкае вяшчанне канала «Культура» ў большасці складаюць арыгінальныя творы, зробленыя ў студыйных умовах Беларускага радыё. Чытанні мастацкай літаратуры з'явіліся ў эфіры канала з першых дзён працы. У той час не было магчымасці ажыццявіць пастаноўку арыгінальных радыёспектакляў, паколькі ішоў капітальны рамонт студый гуказапісу, таму кіраўніцтвам канала (першым дырэктарам у 2002–2016 гг. была К. Агеева) увасоблена ідэя мастацкага чытання ў прамым эфіры. У выніку, у сетцы з'явіліся штодзённыя праекты «Бестселер», у якім чыталася замежная літаратура, і «Беларуская анталогія», дзе слухачы знаёміліся з айчыннай класікай і сучаснымі творамі літаратуры [1]. Праекты трансфармаваліся і сёння выходзяць пад назвамі «Радыёбібліятэка» і «Літаратурная анталогія». Унікальнасць апошняга заключаецца ў тым, што ён выходзіць у прамым эфіры з «жывым» выкананнем артыстаў (Л. Пташук, М. Захарыі, А. Вінярскага і інш.).

Паэтычная спадчына беларускіх аўтараў выкарыстоўваецца ў напаўненні перадачы выхаднога дня «Прачулым радком» (рэдактар Н. Гальпяровіч). У вяшчальным сезоне 2022 г. з'явіўся літаратурна-мастацкі праект «Адным штрыхом», які таксама прапануе выбраныя вершы айчынных аўтараў, абразкі, цытаты, фрагменты твораў беларускіх пісьменнікаў і закліканы павысіць цікавасць да нацыянальнай літаратуры. Дарэчы, арыгінальным, на нашу думку, аўтарскім праектам, які выходзіў на «Культуры» з верасня 2020 г. да

канца 2021 г. і спалучаў у сабе дакументальны і літаратурна-мастацкі матэрыял, з'яўлялася перадача Н. Гальпяровіча «Сюжэт для вечнасці». Журналіст, паэт, намеснік дырэктара канала «Культура» знаёміў радыёслухачоў з уласнымі паэтычнымі і празаічнымі творамі, у якіх адлюстравана станаўленне творчай асобы Н. Гальпяровіча ў асяроддзі малой радзімы – Полацка.

У якасці матэрыялаў для літаратурных праектаў пераважна выкарыстоўваюцца празаічныя і паэтычныя творы, у якіх адлюстраваны нацыянальныя звычаі беларусаў, сямейныя каштоўнасці, ідэі адданасці роднай зямлі, пошуку сябе ў гэтым свеце, уздымаюцца агульначалавечыя філасофскія пытанні.

У эфіры «Культуры» транслююцца радыёспектаклі, што сталі набыткамі літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё ў XX ст., а таксама сучасныя арыгінальныя пастаноўкі (перадачы «Радыётэатр плюс» і «Дзіцячы радыётэатр»). На сённяшні момант на канале «Культура» створаны 4 паўнавартасныя радыёспектаклі. Казка «Падарожжа ў краіну мурашоў» (2018 г.) па п'есе Т. Мушынскай стала першай радыёпастаноўкай для дзяцей у дзейнасці Беларускага радыё ў XXI ст. Яна вучыць паважаць родную прыроду і цікавіцца ёю. У той жа год была пастаўлена п'еса Я. Конева «Танец з рапірай», прызнаная найлепшай па выніках конкурсу «Беларускі радыётэатр у XXI стагоддзі», арганізаванага каналам «Культура». У цэнтры ўвагі – станаўленне асобы будучай спартсменкі, чэмпіёнкі Алены Смолікавай [2]. У 2019 г. у эфіры адбылася прэм'ера радыёверсіі спектакля Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы «Чорная панна Нясвіжа» па аднайменнай п'есе А. Дударава. Лейтматывам праз увесь спектакль праходзіць хрысціянская думка «Бог ёсць любоў». Радыёверсія пастаноўкі Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі «Беларусь. Дыдактыка» паводле твораў айчынных літаратурных класікаў і ўспамінаў народнай артысткі Беларусі Т. Мархель запісана ў 2019 г. Гэты твор заклікаі звярнуць увагу слухачоў на духоўныя здабыткі народа, лад жыцця і побыт нашых продкаў, а таксама на літаратурныя помнікі, што зафіксавалі асаблівасці беларускай душы і нацыі.

Палітру літаратурна-мастацкага арыгінальнага вяшчання канала «Культура» дапаўняе штодзённы праект «Вячэрняя казка», у якім на беларускай мове гучаць народныя і аўтарскія казкі, што садзейніча-

юць выхаванню дзяцей на аснове мудрасці продкаў і вопыту сучасных пісьменнікаў, пераемнасці духоўных традыцый нашага народа.

Эфір канала «Культура» транслюецца на рэспубліку праз радыёхвалі, з 2005 г. – гучыць анлайн у інтэрнэце. Афіцыйны сайт канала www.radiokultura.by утрымлівае аўдыяльны архіў выбраных праграм, даступны інтэрнэт-карыстальнікам на працягу месяца, што пашырае прысутнасць мастацкага беларускага радыёкантэнту ў сусветнай медыяпрасторы. Для папулярызацыі брэнда і ўласных перадач канал «Культура» выкарыстоўвае сацыяльныя сеткі, засвойвае відэазапіс.

Такім чынам, стан і развіццё вяшчання канала «Культура» абумоўлены значнай роляй культуры і мастацтва ў фарміраванні духоўных каштоўнасцей нашага грамадства, усведамленнем важнасці захавання нацыянальных мастацкіх традыцый, аднаўлення назапашанага практычнага вопыту медыякультуры Беларусі, а таксама тэхнічнай эвалюцыяй радыё. Канал «Культура» з’яўляецца творча-вытворчай структурнай адзінкай Беларускага радыё, якая рэтранслюе і стварае ўнікальны мастацкі кантэкт, што з’яўляецца часткай нацыянальнай культуры Беларусі, а таксама ўсёй сусветнай медыяпрасторы.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Гісторыя канала «Культура» // Канал «Культура» Беларускага радыё. – 2021. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://radiokultura.by/be/content/gistoryya-kanala-kultura. – Дата доступу: 11.12.2021.

2. Трапянок, У. А. Спецыфіка развіцця радыётэатра ў медыяпрасторы Беларусі / У. А. Трапянок; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск: БДУКМ, 2019. – 208 с.